ПЕР. КОРОЛЕНКО 18
БИБ. КЕ КОРОЛЕНКО

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МЕНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 283 (6259) | 10 снежня 1938 г., субота | ЦАНА 10 КАП.

СЕННЯ Ў НУМАРЫ:

Паведамленне ТАСС аб рыбалоўных перагаворах з Японіяй.

Сход актыва комсамольскай арганізацыі Менска.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЕ:

Ф. Кошалёў — «Легальны марксізм».

Н. Дзінерштэйн, Б. Эйдзінаў — Індывідуальная кансультацыя.

С. Казначэеў — Небольшэвіцкія адносіны да інтэлігенцыі.

Агляд друку: Ярчэй і глыбей асвятляць партыйнае жыццё.

АРТЫКУЛЫ:

Перадавы артыкул «Праўды» — Выхоўваць калгаснікаў у духу строгага захавання калгаснага статута.

Акадэмік О. К. Кедраў-Зіхман — Да снежаньскай сесіі Акадэміі навук БССР.

Н. Рэпін — 226 тысяч рублёў за лён.

М. Бергер — Кузня музыкальных кадраў.

К. Сяргееў — Ажывіць работу калгасных рэвізійных камісій.

МАЛЕНЬКІ ФЕЛЬЕТОН: **С. Краўцоў** — Спакойна, грамадзяне!..

Закрыўся першы з'езд Саюза совецкіх мастакоў БССР.

ЗА РУБЯЖОМ:

Палітбюро ЦК іспанскай компартыі аб становішчы на франтах і аб чарговых задачах.

Адкрылася надзвычайная сесія французскага парламента.

Новыя патрабаванні гітлераўцаў у Польшчы.

Ганенні на яўрэяў у Германіі.

На франтах у Іспаніі.

УЗОРНА ПАДРЫХТАВАЦЦА ДА УСЕСАЮЗНАГА ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА

17 студзеня 1939 г. пачнецца ўсесаюзны перапіс насельніцтва. Цяжка пераацаніць значэнне гэтага важнейшага дзяржаўнага мерапрыемства. У нашай краіне роля дакладнага ўчоту выключна вялікая. Ленін не раз падкрэсліваў, што социялізм — гэта ўчот, што без правільна наладжанага ўчоту немагчыма весці социялістычную планавую гаспадарку.

«Ніякая будаўнічая работа, — гаварыў таварыш Сталін на XIII з'ездзе партыі, — ніякая дзяржаўная работа, ніякая планавая работа нямысліма без правільнага **ўчоту**. А ўчот нямыслім без статыстыкі. Учот без статыстыкі ні кроку не рушыцца ўперад».

Усесаюзны перапіс насельніцтва — гэта ўчот самага каштоўнага капітала нашай краіны — людзей, і таму ён набывае асаблівую важнасць. Вынікі перапісу адлюструюць поўную карціну колькасці насельніцтва нашай краіны, яго палавога і ўзроснага састава, роду заняткаў, адукацыі. Гэтыя весткі дадуць магчымасць яшчэ з большым поспехам планаваць развіццё нашай народнай гаспадаркі — прамысловасці, сельскай гаспадаркі, чыгуначнага і воднага транспарта, яшчэ вышэй падняць культурна-бытавое будаўніцтва. Вынікі перапісу будуць спрыяць і далейшаму ўмацаванню абароназдольнасці краіны социялізма.

У 1897 г. царская Расія правяла адзіны ўсеагульны перапіс насельніцтва. Ён выявіў жудаснае становішча, — жабрацтва, галечу і бескультур'е народных мас. Не дарэмна царскі ўрад імкнуўся ўсяляк утаіць ад грамадскай думкі сумныя вынікі перапісу.

У краінах капіталізма перапісы насельніцтва маюць галоўным чынам падатковыя і вайсковыя мэты. Даныя перапісаў скарыстоўваюцца буржуазнымі ўрадамі для «вынаходства» новых метадаў аграблення працоўных, прыгнечання нацыянальных меншасцей, узмацнення падрыхтоўкі да імперыялістычных войн.

Буржуазная статыстыка жульніцка «апрацоўвае» матэрыялы перапісаў, каб утаіць сапраўднае становішча ў краіне, — колькасць беспрацоўных, непісьменных і т. д. У рэзультаце атрымліваецца, як гаварыў Ленін, «... у корані няправільная, зусім скажаючая сапраўднае становішча справы, — але якая вельмі падабаецца буржуазіі — карціна **прытуплення класавых супярэчнасцей** у капіталізме» (**Ленін**, том XVII, стар. 619).

Перапісы насельніцтва ў совецкай дзяржаве ў корані адрозніваюцца і па свайму характару і па сваёй мэтаімкненасці ад перапісаў у капіталістычных краінах. Нашы перапісы накіраваны на тое, каб, маючы дакладныя даныя аб колькасці і саставе насельніцтва, арганізаваць яшчэ лепш абслугоўванне яго, задавальненне штодзённых патрэб шырокіх працоўных мас.

Увесь свет убачыць у выніках перапісу велізарныя дасягненні нашай краіны, атрыманыя пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і вялікага Сталіна. Даныя перапісу пакажуць, як з года ў год у СССР павялічваецца нараджаемасць, падае смертнасць, няўхільна падымаецца культурны ўзровень працоўных. Лічбы перапісу яшчэ раз прадэманструюць перад усім светам, што ў нашай краіне поўнасцю ліквідавана беспрацоўе, што ў нас з сапраўды цудоўнай хуткасцю растуць кадры, людзі новых прафесій, высокакваліфікаваныя рабочыя, новая совецкая інтэлігенцыя.

Для Совецкай Беларусі, якая знаходзіцца на рубяжы з капіталістычным светам, перапіс мае асабліва важнае значэнне. Ён адлюструе радаснае і шчаслівае жыццё беларускага народа пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, эканамічны і палітычны росквіт нашай рэспублікі.

Да пачатку перапісу асталося паўтара мала часу — крыху больш месяца. У БССР разгорнута значная падрыхтоўка да яго. Каля 15 тысяч чалавек — кіруючага персанала, інструктараў-кантралёраў, шчотчыкаў будзе занята ў правядзенні перапісу. Гэтыя людзі падабраны з ліку агітатараў і актывістаў прайшоўшых выбарчых кампаній па выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР з ліку правераных, перадавых работнікаў.

Ужо закончан інструктаж кіруючых перапісных кадраў. Зараз усюды працуюць курсы шчотчыкаў перапісу. У сельскіх мясцовасцях праходзіць удакладненне пагаспадарчых кніг, у гарадах — дамавых кніг, адначасова правяраюцца спіскі населеных месц і домаўладанняў.

Трэба ўсяляк вітаць ініцыятыву Менскага гаркома партыі. Ён арганізаваў аднадзённы семінар для актыва, які праводзіць масавую растлумачальную работу сярод насельніцтва вакол перапісу. Праз гэты семінар будзе прапушчана 2.500 чалавек.

Падрыхтоўка да перапісу — гэтага важнейшага гаспадарча - палітычнага мерапрыемства — справа ўсіх партыйных, совецкіх, комсамольскіх, профсаюзных і грамадскіх арганізацый. Але, на жаль, у некаторых гарадах і раёнах БССР гэтага яшчэ не зразумелі. Сігналы з месц сведчаць аб тым, што асобныя кіраўнікі недаацэньваюць значэння падрыхтоўкі да перапісу і лічаць гэта справай выключна органаў наргасучоту.

Барысаўскі райком партыі і райвыканком не толькі не кіруюць падрыхтоўкай да перапісу, але і тармозяць мерапрыемствы, якія праводзяць органы наргасучоту. Людзей, якія былі самім райвыканкомам вылучаны ў якасці памочнікаў загадчыкаў перапіснымі аддзеламі, райком партыі адарваў ад інструктыўных заняткаў і даў ім іншыя даручэнні. Райвыканком у самы напружаны перыяд падрыхтоўкі да перапісу перасяліў інспектуру наргасучоту ў другі пакой, пакінуўшы яго нават без тэлефона.

Аб падобных-жа фактах паведамляюць рэдакцыю і з Лагойскага, Рудзенскага, Старобінскага, Плешчаніцкага і іншых раёнаў Беларусі.

Ужо больш двух месяцаў, як інспектура наргасучоту Свяцілавіцкага раёна дабіваецца перад райвыканкомам прадастаўлення прыгоднага памяшкання для работы. Старшыня РВК тав. Волкаў толькі абяцае прыняць меры, а практычна нічога для гэтага не робіць.

У радзе месц, не гледзячы на зусім чоткую дырэктыву ўрада, кіруючыя арганізацыі не клапоцяцца аб забеспячэнні работнікаў перапісу сродкамі перасоўвання. У Бабруйскім раёне работнікі наргасучоту часта не могуць выехаць у сельсоветы з-за адсутнасці транспартных сродкаў. Менскі райвыканком «дапамог» работнікам наргасучоту — выдзеліў у іх распараджэнне адну легкавую машыну, але... без пакрышак.

Наўрад ці трэба даказваць, што поспех перапісу ў значнай меры будзе залежаць ад папярэдне праведзенай агітацыйна-масавай работы. Між тым у многіх гарадах і раёнах рэспублікі гэта важнейшая справа ігнаруецца. У Заслаўскім, Дубровенскім, Веткаўскім і ў іншых раёнах дагэтуль амаль не пачыналася масавая работа. Насельніцтву не растлумачаны мэты і значэнне перапісу, а таксама як ён будзе праводзіцца.

Задача ўсіх партыйных, совецкіх і грамадскіх арганізацый — зараз-жа рашуча ўзмацніць падрыхтоўку да перапісу, забяспечыць узорнае правядзенне яго. Трэба максімальна ажывіць работу брыгад садзейнасці перапісу (а там, дзе іх яшчэ няма, неадкладна арганізаваць), уцягнуць у падрыхтоўку да перапісу партыйны, совецкі, профсаюзны і комсамольскі актыў.

Матэрыялы праведзенага ў студзені 1937 года ўсесаюзнага перапісу насельніцтва, як вядома, былі прызнаны ўрадам СССР дэфектыўнымі. Подлыя ворагі народа, якія арудвалі тады ў Цэнтральным упраўленні наргасучоту, прыклалі ўсе сілы, каб правесці перапіс па-шкодніцку, каб скажона паказаць нашу социялістычную рэчаіснасць.

Слаўнай совецкай разведкай ворагі выкрыты і разгромлены. Совецкі народ з велізарным задавальненнем сустрэў пастанову ўрада СССР аб правядзенні новага перапісу 1939 года. Гэты перапіс адлюструе сапраўдную красачную рэчаіснасць нашай шчаслівай радзімы.

Справа гонару кожнага партыйнага і непартыйнага большэвіка — прыняць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да перапісу, садзейнічаць таму, каб ён быў праведзен сапраўды па-большэвіцку.

НОВЫЯ ПАТРАБАВАННІ ГІТЛЕРАЎЦАЎ У ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 9 снежня. (ТАСС). Паводле вестак газеты «Кур'ер польскі», кіраўнік агентуры германскага фашызма ў Польшчы, так званай «Юнгдэйчэ партэй», былы сенатар Візнер уручыў прадстаўнікам польскага ўрада мемарандум, у якім патрабуе «ўрэгулявання» становішча немцаў у Цешынскай Сілезіі. У мемарандуме ёсць, між іншым, патрабаванне прызнаць роўнапраўе нямецкай мовы з польскай, адкрыць усе нямецкія школы, бібліятэкі і камерцыйныя кніжныя магазіны, закрытыя ў кастрычніку польскімі акупацыйнымі ўладамі, аднавіць распушчаныя польскімі ўладамі нямецкія арганізацыі, дапусціць да работы ў дзяржаўных адміністратыўных установах і ў прамысловасці немцаў, устанавіць малы пагранічны рух паміж Польшчай і Германіяй у раёне Цешынскай Сілезіі і т. д. Новыя патрабаванні германскіх гітлераўцаў у Польшчы выклікаюць сур'ёзную трывогу ў колах польскай грамадскасці.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС ДА РЫБАЛОЎНЫХ ПЕРАГАВОРАЎ

Як ТАСС даведаўся з аўтарытэтных крыніц, 8 гэтага месяца японскі пасол п. Таго паведаміў Народнаму камісару Замежных Спраў тав. Літвінаву адказ японскага ўрада на яго заяву ад 28 лістапада гэтага года.

1. Японскі ўрад лічыць, што з прычыны такой буйнай падзеі, як «абвяшчэнне незалежнасці», Манчжурыя стала зусім іншай, чым яна была ў час заключэння Портсмуцкага дагавору, і што Японія карыстаецца правам трымаць там войскі на падставе дагавору з Манчжурыяй.

Тав. Літвінаў запярэчыў, што падзея, якую п. пасол называе «абвяшчэннем незалежнасці Манчжуго» мела месца ў выніку ўводу ў Манчжурыю і пакідання там значнай колькасці японскіх войск, што якраз было прадугледжана і забаронена Портсмуцкім дагаворам. Заява японскага ўрада аб прыродзе пяперашняй улады ў Манчжурыі не раздзяляецца не толькі Совецкім Саюзам, але і Лігай нацый, якая яднае яшчэ і зараз каля 60 дзяржаў, а таксама Злучанымі Штатамі Амерыкі. Калі-ж прызнаць, што ў Манчжурыі стварылася такое новае становішча, пры якім не ўсе артыкулы Портсмуцкага дагавору павінны лічыцца абавязковымі, то совецкі ўрад — усё-ж не можа прызнаваць за Японіяй права аднасторонна вырашаць, што адпадаюць толькі артыкулы ёй нявыгадныя, а захоўваюцца ўсе артыкулы, ёй выгадныя. Канстатуючы поўнае разыходжанне пунктаў гледжання Японіі і СССР па гэтаму пытанню, таварыш Літвінаў прапанаваў далейшую дыскусію на гэту тэму, як не маючую рашаючага значэння ў рыбалоўным пытанні, спыніць, з чым п. пасол згадзіўся.

2. П. Таго сказаў, што забароненыя зоны ў Лаперузавым праліве не павінны перашкаджаць свабоднай навігацыі совецкіх суднаў. На гэта таварыш Літвінаў заявіў, што пры адсутнасці права узводзіць ваенныя пабудаванні на берагах праліва, там не павінна быць забароненых зон, але што ён ва ўсякім выпадку прымае да ведамя запэўненне японскага ўрада ў тым, што ў далейшым не будзе чыніцца перашкод свабоднаму плаванню совецкіх суднаў у праліве.

3. Японскі пасол зноў настойваў на адсутнасці ўсякай сувязі паміж плацяжамі за КУЧ і рыбалоўнымі перагаворамі. Трэба вырашаць усе спрэчныя пытанні паасобку, паступова, па парадку. Аднак, сказаў ён, японскі ўрад гатоў будзе спрыяльна разглядзець пытанне аб плацяжы, калі будзе неадкладна, а іменна — да 10 снежня, падпісана рыбалоўная канвенцыя на 8 год у той рэдакцыі, якую зацвердзіў японскі ўрад, але якая да гэтага часу не была адобрана совецкім урадам. Такое паспешнае падпісанне канвенцыі патрабуецца, па думцы пасла, у сувязі з неабходнасцю выканання некаторых фармальнасцей у сілу японскага заканадаўства. Ні на якое іншае рыбалоўнае пагадненне як працяглага, так і часовага характару, Японія не згодна.

Тав. Літвінаў адказаў, што гарантыя плацяжоў па КУЧ не можа быць звязана ці абумоўлена той ці іншай рэдакцыяй рыбалоўнай канвенцыі, і гарантыя павінна быць выканана без усякіх умоў і пры ўсіх акалічнасцях. У гэтым сэнсе сапраўды няма сувязі паміж абодвума пытаннямі. Сувязь заключаецца толькі ў тым, што, не выконваючы сваіх абавязацельстваў, японскі ўрад не павінен так настойліва спасылацца на абавязацельствы Совецкага Саюза, тым больш, што Совецкі Саюз сваіх абавязацельстваў не парушаў. Калі вырашаць спрэчныя пытанні па парадку, то трэба пачаць з плацяжа за КУЧ, пратэрмінаванага ўжо на 9 месяцаў. Існуючае сучаснае рыбалоўнае пагадненне захоўвае сілу яшчэ да 31 снежня. Японцы мелі магчымасць лавіць рыбу да канца сезона і совецкі ўрад не мае намеру пазбавіць іх гэтага права ў далейшым. Новы рыбалоўны сезон наступіць толькі праз некалькі месяцаў. Такім чынам, нават з храналагічнага пункту гледжання, пытанне аб плацяжы па КУЧ павінна мець прыярытэт. Ужытае п. паслом выражэнне «спрыяльна разгледзець» прадстаўляецца няпэўным. Патрабуецца фактычнае ўнясенне плацяжу ў банк, або дакладнае ўказанне даты мяркуемага ўчынення плацяжу. Калі тое ці іншае будзе мець месца да 10 снежня, то совецкі ўрад гатоў неадкладна азнаёміць японскую старану з тымі ўмовамі, на якіх ён згодзен заключыць працяглую рыбалоўную канвенцыю, і зд японскага ўрада будзе ўжо залежаць завяршэнне справы да 10-га.

Тав. Літвінаў зноў напомніў сваю заяву ад 28 лістапада, калі зусім ясна было ўказана рашэнне совецкага ўрада аб тых умовах, пры якіх ён згодзен весці перагаворы аб рыбалоўнай канвенцыі і аб той аснове, на якой можна заключыць часовае рыбалоўнае пагадненне.

Японскі пасол абяцаў змест гутаркі давесці да ведама свайго ўрада.

ГАНЕННІ НА ЯЎРЭЯЎ У ГЕРМАНІІ

ЛОНДАН, 9 снежня (ТАСС). Як паведамляе карэспандэнт газеты «Манчэстэр гардыян», германскі ўрад мае намер перадаць 40 тысяч яўрэйскіх кватэр у Берліне «арыйцам». Яўрэям будзе дазволена жыць у дробных прыгарадных дамах, што належаць яўрэям-жа. Па словах карэспандэнта, германскі ўрад лічыць, што ў кожным такім яўрэйскім доме павінна жыць не менш пяці яўрэйскіх сем'яў. Карэспандэнт далей указвае, што яўрэі гатовы адмовіцца ад усёй належачай ім маёмасці, абы толькі ім далі дазвол пакінуць Германію.

СХОД АКТЫВА КОМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ МЕНСКА

Ленінска-сталінскі комсамол і ўся совецкая моладзь з велізарным задаволеннем сустрэлі рашэнні VII пленума ЦК ВЛКСМ аб выгнанні з кіраўніцтва ЦК комсамола палітычна-абанкроціўшыхся, маральна-разлажыўшыхся, наскрозь прагніўшых былых кіраўнікоў ЦК ВЛКСМ Косарэва, Вяршкова і іх прыспешнікаў.

Той факт, што ў рабоце VII пленума ЦК ВЛКСМ прымалі ўдзел таварышы Сталін, Андрэеў, Жданаў, Шкіратаў, Маленкоў, гаворыць аб тым, што Цэнтральны Камітэт нашай партыі і асабіста таварыш Сталін непасрэдна дапамагаюць і кіруюць справай ачышчэння кіруючых комсамольскіх органаў ад палітычных абывацеляў, палітыканаў і двурушнікаў, якія насаджаліся і падтрымліваліся былым кіраўніцтвам ЦК ВЛКСМ.

Аб тым, што такія, з дазволу сказаць, кіраўнікі яшчэ асталіся, сведчаць сходы актыва комсамольскіх арганізацый Масквы і Ленінграда, прагнаўшыя з кіраўніцтва гэтых буйнейшых арганізацый комсамола капіроўшчыкаў гнілой антыпартыйнай практыкі, палітычна-абанкроціўшыхся былых кіраўнікоў ЦК ВЛКСМ.

Сход комсамольскага актыва Менска паказаў, што і ў комсамольскай арганізацыі Беларусі, у прыватнасці ў Менскай арганізацыі комсамола культывіраваліся парочныя метады кіраўніцтва.

Сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Кавалькоў у сваім несамакрытычным дакладзе ўсе недахопы работы бюро ЦК ЛКСМБ звёў да таго, што на бюро амаль не ставіліся палітычна вострыя, жыццёвыя пытанні работы комсамольскай арганізацыі рэспублікі, што бюро ЦК больш за ўсё займалася пытаннямі прадастаўлення адпускоў і аказанне матэрыяльнай дапамогі кіруючым комсамольскім работнікам.

Дакладчык абышоў тое, што некаторыя кіраўнікі абласных комсамольскіх арганізацый уяўляюць з сябе чынуш і вяльмож, да якіх радавому комсамольцу нельга падступіцца. Ён не гаварыў і аб тым, што ЦК ЛКСМБ палітычна блізарука падыходзіць да падбору кадраў кіруючых работнікаў, што ў рабоце комсамольскіх органаў, уключаючы і ЦК, адсутнічае калегіяльнасць. ЦК ЛКСМБ не кіруе абаронай і фізкультурнай работай, не арганізоўвае дапамогі комсамольцам, якія вывучаюць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» і творы класікаў марксізма-ленінскай тэорыі.

Спрэчкі, якія прадаўжаліся 8 і 9 снежня, ускрылі парокі і недахопы, якія ёсць у рабоце ЦК ЛКСМБ, гаркома і горрайкомаў комсамола Менска. Комсамольцы-актывісты нізавых арганізацый з самага пачатку спрэчак проста, па-дзелавому, поўным голасам загаварылі аб неабходнасці рашуча пакончыць з парочным стылем кіраўніцтва.

Выступіўшыя ў спрэчках тт. Панкратаў (Педінстытут), Еўласьеў (Акадэмія навук), Ліберман (загадчык аддзелам вучнёўскай моладзі гаркома КСМ), Вітнер (завод «Ударнік») і іншыя падвергалі жорсткай крытыцы работу Цэнтральнага і Менскага камітэтаў комсамола. Выступаўшыя адзначылі, што тав. Кавалькоў у сваім дакладзе зрабіў лёгкі экскурс па ўсёй рэспубліцы, імкнучыся сказаць аб усім і не сказаў аб галоўным: чаму не выконваюцца рашэнні IV пленума ЦК ВЛКСМ, як ЦК ЛКСМБ вёў барацьбу з замаскіраваўшымися ў арганізацыях варожымі элементамі, якое становішча спраў менскай комсамольскай арганізацыі. Той факт, што тав. Кавалькоў умаўчаў аб гэтых важнейшых пытаннях, сведчыць аб парочным, кабінетным стылі кіраўніцтва, аб адрыве кіраўнікоў ЦК ЛКСМБ ад комсамольскіх арганізацый, сведчыць аб няведанні таго, што робіцца ў арганізацыях.

Сакратар комсамольскага камітэта Менскага педагагічнага інстытута імя Горкага тав. Панкратаў адзначыў у сваім выступленні, што адзін з былых комсамольцаў інстытута яшчэ чатыры годы таму назад быў выключан з комсамола як трацкісцкі прыспешнік. Нядаўна ЦК комсамола, без згоды комсамольскай арганізацыі інстытута, аднавіў яго ў комсамоле, а праз некалькі дзён гэты новаяўлены «комсамолец» быў выкрыт органамі НКВД як вораг народа. Тав. Панкратаў гаворыць, што гэта не адзін выпадак, што такія выпадкі мелі месца ў практыцы работы Менскага гаркома комсамола.

Тав. Вітнер адзначыў, што ў гаркоме практыкуецца недапушчальна бюракратычны стыль работы.

— Мяне аднойчы, — гаворыць ён, — тэрмінова выклікалі з цэха і прапанавалі безадкладна з'явіцца ў гарком нібыта па вельмі важнаму пытанню. Я прышоў, а мне ўручаюць пакет з пастановаю аб вячэрняй асвеце. І толькі дзеля гэтага бюракраты з гаркома часта адрываюць многіх таварышоў ад работы на вытворчасці.

Зварот маладых стаханаўцаў Харкаўскага трактарнага завода аб прадаўжэнні социялістычнага спаборніцтва імя 20-годдзя ВЛКСМ не знайшоў ніякага водгуку ў ЦК і ГК комсамола і быў імі адразу забыты.

Выступаючыя адзначаюць, што ніхто з кіруючых работнікаў ЦК, гаркома і горрайкомаў комсамола не бывае ў нізавых арганізацыях, не дапамагае ў рабоце, не ведае, што там робіцца.

Яўна несамакрытычным было ўчарашняе выступленне на актыве сакратара Менскага гаркома комсамола тав. Рапапорта. Ён усё сваё выступленне звёў да таго, што ў гаркоме дрэнна працуюць аддзелы гаркома, што таксама дрэнна працуюць горрайкомы комсамола Менска.

Побач з крытыкай работы кіруючых комсамольскіх органаў актыў падвергае рэзкай крытыцы рэспубліканскія маладзёжныя газеты «Чырвоная змена» і «Сталинская молодежь» за тое, што яны як след не асвятляюць на сваіх старонках комсамольскага жыцця, не ўзнімаюць важных пытанняў работы комсамольскай арганізацыі Беларусі.

Сённяшні комсамольскі актыў прадаўжае сваю работу.

ВЫХОЎВАЦЬ КАЛГАСНІКАЎ У ДУХУ СТРОГАГА ЗАХАВАННЯ КАЛГАСНАГА СТАТУТА

Гэтымі днямі ў «Правде» была апублікавана пастанова Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) **«Аб размеркаванні грашовых даходаў у калгасах»**. Гэта пастанова, у сувязі з паступіўшымі хадайніцтвамі мясцовых органаў і калгасаў, уносіць рад змен у артыкул дванаццаты Прыкладнага статута сельскагаспадарчай арцелі, чотка і ясна вызначае парадак размеркавання калгасных грашовых даходаў. Яна, несумненна, будзе мець вялікае значэнне ў далейшым арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў, бо кожны яе радок адпавядае патрэбнасцям практыкі, пранікнут клопатамі партыі і ўрада аб росквіце калгасаў — гэтай асновы, на якой грунтуецца матэрыяльны добрабыт совецкага сялянства.

Рост грашовых даходаў калгасаў — факт несумненны і вельмі радасны. Ужо многія тысячы калгасаў вылічваюць свае грашовыя даходы сотнямі тысяч і мільёнамі рублёў. Рост грашовых даходаў асабліва ўзмацніўся ў гэтым годзе пасля таго, як Совет Народных Камісараў і Цэнтральны Камітэт партыі ў пастанове «Аб няправільным размеркаванні даходаў у калгасах» звярнулі ўвагу ўсіх партыйных і совецкіх арганізацый на неабходнасць заняцца як след грашовай гаспадаркай калгасаў. Гаспадарка гэта становіцца з кожным годам усё больш абшырнай, і тут павінны быць узорны парадак, старанны ўчот, поўнае веданне калгаснікамі таго, куды і як трацяцца грошы.

З атрымліваемых арцеллю грашовых даходаў арцель перш за ўсё «ўносіць дзяржаве ўстаноўленыя законам падаткі, робіць страхавыя плацяжы і зварот грашовых ссуд у першачарговым парадку». Такім чынам, закон падкрэслівае, што выкананне калгасам сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай з'яўляецца першай і непарушнай заповедзю.

Далей, арцель робіць неабходныя расходы на бягучыя вытворчыя патрэбы, пакрывае адміністратыўна-гаспадарчыя расходы, выдзяляе сродкі на культурныя патрэбы і папаўняе непадзельны фонд. Уся сума, што асталася, размяркоўваецца арцеллю паміж членамі арцелі па працадзнях. Устаноўлены парадак размеркавання грашовых даходаў калгасаў поўнасцю адпавядае як інтарэсам калгаснай вытворчасці, так і інтарэсам калгаснікаў. Гэта можна прасачыць хоць-бы на прыкладзе таго, як папаўняюцца непадзельныя фонды.

Вядома, што да апошняга часу для ўсіх калгасаў існаваў такі парадак папаўнення непадзельных фондаў: у непадзельны фонд арцель адлічала не звыш 10 процантаў сваіх грашовых даходаў. Зараз гэты парадак зменен: адлічэнне на папаўненне непадзельных фондаў робіцца ў зернавых раёнах у размеры не менш 12, але не больш 15 процантаў, у раёнах тэхнічных культур і жывёлагадоўчых — у размеры не менш 15, але не больш 20 процантаў ад грашовых даходаў арцелі. Чаму прадугледжаны розныя размеры адлічэнняў у непадзельныя фонды, скажам, для зернавых і жывёлагадоўчых раёнаў? Тлумачыцца гэта асаблівасцямі вытворчасці. У зернавым калгасе сельскагаспадарчыя работы праводзяцца галоўным чынам машынамі, належачымі МТС. Калгасу, значыць, няма патрэбы клапаціцца аб будаўніцтве гаражоў, майстэрняў і т. п. Іншая справа — у жывёлагадоўчым калгасе. Тут трэба будаваць фермы, скотныя двары, свінарнікі, памяшканні для падрыхтоўкі кармоў і т. п. Ясна, што вытворчых расходаў у жывёлагадоўчым калгасе куды больш, чым у зернавым. Урад і Цэнтральны Камітэт партыі ўлічваюць гэтыя патрэбнасці калгаснай вытворчасці і ідуць насустрач калгаснікам. **Чым мацней будзе калгасная гаспадарка, чым вышэй гаспадарчая магутнасць калгасаў, тым заможней будуць калгаснікі. Калгас, арцельная гаспадарка — гэта асноўная крыніца добрабыту калгаснікаў.**

На жаль, яшчэ ёсць факты, якія сведчаць аб тым, што некаторыя партыйныя і совецкія арганізацыі, асобныя кіраўнікі не зразумелі сутнасці Прыкладнага статута сельскагаспадарчай арцелі, не зразумелі ўказанняў таварыша Сталіна аб правільным спалучэнні грамадскіх інтарэсаў калгасаў і асабістых інтарэсаў калгаснікаў і замест таго, каб выхоўваць калгаснікаў у духу калгаснага статута, дапускаюць грубейшыя парушэнні гэтага закона, праяўляюць бясклопатныя адносіны да парушальнікаў статута.

З Бярэзінскага раёна (Беларуская ССР) нас паведамляюць, што праўленне калгаса «Новае Забор'е» здало ў арэнду калгаснікам участак зямлі тэрмінам на пяць год. У тым-жа раёне, у калгасе «Іскра» некалькі калгаснікаў мае сваіх коней, прысядзібныя ўчасткі ў рада калгаснікаў перавышаюць па сваіх размерах статутныя нормы. Ёсць калгаснікі, якія маюць па тры каровы і дзве цёлкі. Калгас «Іскра» — самы адстаючы ў раёне; у гэтым калгасе панае безгаспадарчасць, якая мяжуе з прамым шкодніцтвам: загінула віка з плошчы ў 4,5 гектара, згніялі каля тоны пянькі, гніе пакінутая пад адкрытым небам насенная канюшына.

У радзе калгасаў Магілеўскай вобласці некаторыя калгаснікі, наперакор статуту, маюць коней, маюць у асабістым карыстанні больш жывёлы, чым гэта дапускаецца статутам арцелі. У Быхаўскім раёне, напрыклад, 23 калгаснікі маюць коней і 252 калгаснікі маюць па 2 каровы. У Магілеўскім раёне 32 калгаснікі маюць коней і 307 калгаснікаў маюць па 2 каровы.

Прыведзеныя факты гавораць аб праяўленні буржуазных тэндэнцый у асобных калгасах. Гэтыя тэндэнцыі заносяцца ў калгасы астаткамі разбітага кулацтва або малаўстойлівымі, яшчэ не выхаванымі ў духу калгаснага ладу асобнымі калгаснікамі. Трэба зразумець, што парушэнні статута вядуць да падрыву калгаса і выклікаюць нездавальненне калгаснікаў. Трэба рашуча і рэзка асудзіць няправільную, небольшэвіцкую практыку бясклопатных адносін да парушэнняў статута.

Правільна праводзіць Статут сельскагаспадарчай арцелі — гэта значыць няўтомна выхоўваць калгаснікаў у социялістычным духу, выхоўваць у барацьбе з праяўленнем буржуазных тэндэнцый, у барацьбе з лодырамі, дэзарганізатарамі калгаснай вытворчасці, няўтомна працаваць над павышэннем гаспадарчай магутнасці калгасаў, каб кожны калгаснік бачыў і адчуваў сілу калгаса. Рост даходаў калгаснікаў павінен праходзіць шляхам росту працадня, а не шляхам незаконнага пашырэння прысядзібных участкаў. Прысядзібны ўчастак, жывёла ў асабістым карыстанні калгаснікаў маюць **падсобнае** значэнне, а асноўнае, галоўнае — у калгасе, у грамадскай, социялістычнай гаспадарцы.

А на практыцы часам незадачлівыя кіраўнікі, ведаючы аб тым, што калгаснікі цікавяцца пашырэннем садаводства або гародніцтва, ахвотна ідуць на незаконнае пашырэнне прысядзібных участкаў або нават здаюць у арэнду зямлю, прадастаўленую дзяржавай у карыстанне калгаса. І гэта замест таго, каб неадкладна, з энергіяй, уласцівай сапраўдным большэвікам, узяцца за насаджэнне **калгасных** садоў, за расшырэнне **калгасных** гародаў. Такія кіраўнікі потым разводзяць рукамі, адмаўляючыся разумець прычыны прагулаў, прычыны нядбайных адносін некаторых калгаснікаў да грамадскай працы.

Тая выключная ўвага, якую праяўляюць Цэнтральны Камітэт партыі і Совецкі Урад да правядзення Статута сельскагаспадарчай арцелі, абавязвае ўсе партыйныя і совецкія арганізацыі яшчэ больш умацаваць свае сувязі з калгасамі, ведаць усё, што адбываецца ў калгасах, і безумоўна пакончыць з парушэннямі статута. На камісіі другога з'езда калгаснікаў-ударнікаў таварыш Сталін гаварыў:

«Мы з вамі пішам законы. А Статут — гэта вышэйшы закон, асноўны закон пабудовы новага грамадства ў вёсцы».

Ясна, што ўсе нашы намаганні павінны быць накіраваны на тое, каб гэты вышэйшы закон выконваўся без усякіх скажэнняў і парушэнняў, каб многамільённае калгаснае сялянства спазнала поўнасцю вялікую сілу Сталінскага статута шчаслівага калгаснага жыцця.

(«ПРАВДА», 8 снежня 1938 г.).

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ

З выхадам у свет «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» многія комуністы, комсамольцы, інтэлігенцыя і служачыя менскай скургалантарэйнай фабрыкі імя Куйбышэва прыступілі да самастойнага вывучэння гісторыі большэвіцкай партыі.

Вывучаючы самастойна першы раздзел «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», тт. Мінц, Адамовіч, Цуркоў, Мебель і іншыя прачыталі рад ленінска-сталінскіх твораў: «Развіццё капіталізма ў Расіі», «50-годдзе падзення прыгоннага права», «Рабочая партыя і сялянства», «Аграрнае пытанне ў Расіі XIX стагоддзя» і рад іншых матэрыялаў з газеты ў дапамогу партвучобе.

Улічваючы запытанні таварышоў, самастойна вывучаючых гісторыю ВКП(б), партыйны камітэт днямі правёў індывідуальную кансультацыю па пытанню развіцця капіталізма ў Расіі. У якасці кансультанта быў запрошан высокакваліфікаваны прапагандыст тав Драгілеў.

У падрыхтоўцы да кансультацыі партыйны камітэт правёў значную работу. Таварышам быў раздан рэкамендацыйны спіс літаратуры па гэтай тэме. У парткабінеце фабрыкі была арганізавана выстаўка літаратуры і наглядных дапаможнікаў з альбома гісторыі ВКП(б) на тэму «Развіццё капіталізма ў Расіі». Задоўга да правядзення кансультацыі партыйная арганізацыя шырока абвясціла таварышам аб прадстаячай кансультацыі.

Праведзеная работа дала свае рэзультаты. На кансультацыі прысутнічала больш 10 чалавек, сярод іх тэхнарук фабрыкі тав. Шыфрын, інжынер фабрыкі Мінькоў, юрыст тав. Юдзін, урач тав. Ландо, стаханаўцы тт. Мееровіч, Сонкіна і іншыя.

Комуністы, інтэлігенцыя цікавіліся пытаннямі: з чаго выходзілі народнікі, вызначаючы «самабытны» шлях у развіцці Расіі; ці можна гаварыць аб прамысловым перавароце ў Расіі; адносіны памешчыкаў да праектаў «вызвалення» сялян; што пераважала пры «вызваленні сялян»: страх перад сялянскімі паўстаннямі — новым Пугачовым, ці жаданне па-новаму весці гаспадарку.

На ўсе пытанні таварышы атрымалі вычарпальныя адказы.

Тэхнолаг фабрыкі тав. Цуркоў выясніў у тав. Драгілева такія пытанні: супярэчнасці паміж капіталістычнымі адносінамі і прыгонніцкай сістэмай; у сілу якіх прычын адбываецца развіццё таварна-грашовых адносін у першай палавіне XIX стагоддзя; якія супярэчнасці былі ў развіцці прадукцыйных сіл царскай Расіі з вытворчымі адносінамі.

Многія пытанні выяснілі на кансультацыі тэхпроп фабрыкі тав. Мінц, Мебель і інш.

Па сканчэнні кансультацыі таварышы прасілі партыйны камітэт часцей праводзіць такія кансультацыі. Яны таксама прасілі ў бліжэйшыя дні арганізаваць кансультацыі метадычнага характару, як трэба самастойна працаваць над «Кароткім курсам гісторыі ВКП(б)».

Н. ДЗІНЕРШТЭЙН,
Б. ЭЙДЗІНАЎ.

НЕБОЛЬШЭВІЦКІЯ АДНОСІНЫ ДА ІНТЭЛІГЕНЦЫІ

ЧАВУСЫ. **(Спец. кар. «Звязды»).** У пачатку снежня настаўнікі раёна атрымалі ад Чавускага райана і райкома партыі запрашэнне прыбыць 4 снежня на раённую нараду настаўнікаў-выдатнікаў.

У паведамленні пісалася, што нарада абмяркуе два пытанні: аб выніках першай чвэрці вучэбнага года і аб марксісцка-ленінскім выхаванні настаўнікаў у сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Настаўнікі ў надзеі атрымаць дапамогу па вывучэнню гісторыі ВКП(б) актыўна адгукнуліся на запрашэнне райана і райкома партыі. На нараду з усіх канцоў раёна прыбыло 85 лепшых настаўнікаў-выдатнікаў.

Але арганізатары нарады здзекліва аднесліся да совецкай інтэлігенцыі. Нарада праводзілася ў халоднай зале гарадскога кінотэатра. Людзі сядзелі з паднятымі ўверх каўнерамі. Час-ад-часу загадчык райана тав. Дзергачоў з-за стала прэзідыума звяртаўся да замярзаючых настаўнікаў з просьбай:

— Давайце, таварышы, сядзем бліжэй да сцэны. Мы тут хутчэй сагрэемся...

З дакладам аб марксісцка-ленінскім выхаванні настаўніка—аднаго з самага многалікага атрада совецкай інтэлігенцыі, выступіў прапагандыст райкома партыі тав. Куляшоў.

Даклад быў сухім, нецікавым, без яркіх змястоўных фактаў. Дакладчык не сказаў самага галоўнага, чаго чакалі настаўнікі,—як-жа райком партыі думае арганізаваць дапамогу інтэлігенцыі ў авалоданні марксісцка-ленінскай тэорыяй Не сказалі настаўнікам, дзе і як можна знайсці патрэбную дапаможную літаратуру па вывучэнню гісторыі ВКП(б).

На пытанне — як-жа настаўнікі будуць вывучаць гісторыю ВКП(б) — у гуртках або самастойна — загадчык аддзела прапаганды і агітацыі райкома партыі тав. Салаўёў адказаў, што да 15 снежня гэта вырашыцца і тады будзе дан канкрэтны адказ.

З канца залы данеслася рэпліка: «А зачым-жа нас сюды склікалі?»

Пасля некалькіх рэплік і пытанняў з-за стала прэзідыума абвясцілі:

— З прычыны позняга часу ёсць прапанова спрэчкі не адкрываць.

К канцу нарады ў зале асталося з 85 зарэгістраваных толькі 39 чалавек. Прамерзшы, ніхто ўжо не супраціўляўся прапанове не распачынаць спрэчак.

Так на раённай нарадзе, дзе павінны былі быць абмеркаваны ўсе пытанні, як лепш арганізаваць вывучэнне гісторыі ВКП(б), настаўнікаў фактычна пазбавілі права выказаць сваю думку.

С. КАЗНАЧЭЕЎ.



Тэхнарук інструментальнага цэха віцебскага станкабудаўнічага завода імя Кірава тав. П. Н. Орэшка за вывучэннем гісторыі ВКП(б). Фото С. Грына.

НОВЫЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ НА ВЁСЦЫ

На тэрыторыі Менскага сельскага раёна ствараюцца новыя партарганізацыі. Не так даўно арганізавана пярвічная тэрытарыяльная партарганізацыя пры Ляхавіцкім сельсавеце Раней там не было партарганізацыі, комуністы былі прымацаваны да партарганізацыі суседняга Станькаўскага сельсавета.

Ляхавіцкая тэрытарыяльная партарганізацыя за кароткі тэрмін прыняла ў кандыдаты партыі двух настаўнікаў пачатковай школы.

Створана таксама пярвічная партарганізацыя пры соўгасе «Большэвік». Днямі новая соўгасная партарганізацыя прыняла ў кандыдаты партыі двух таварышаў—заатэхніка і шофера.

У бліжэйшыя дні райком партыі стварае самастойную тэрытарыяльную партыйную арганізацыю пры Кайкаўскім сельсавеце.

НАРАДА ТРЭЦІХ САКРАТАРОЎ РАЙКОМАЎ ПАРТЫІ

МАЗЫР. **(Спец. кар. «Звязды»).** 8 снежня Палескі абком партыі правёў нараду трэціх сакратароў райкомаў КП(б)Б вобласці па пытанню абмену вопытам партыйнай работы.

Трэція сакратары райкомаў расказалі, як яны авалодваюць майстэрствам партыйнага кіраўніцтва, якую атрымліваюць дапамогу ад першых сакратароў райкомаў КП(б)Б і абкома.

Аб няправільнай практыцы першага сакратара Даманавіцкага райкома тав. Гуцэва расказаў трэці сакратар тав. Кацэнельсон:

— Я, — гаворыць ён, — за год работы ў райкоме ні разу не вёў пасяджэння бюро. Былі выпадкі, калі сакратар райкома тав. Гуцэў, ад'язджаючы ў Менск, не рашаўся давяраць мне кіраўніцтва партарганізацыяй і сваім намеснікам пакідаў інструктара райкома.

Трэці сакратар Мазырскага райкома тав. Лукашонак гаварыў, што яму часта прыходзіцца званіць па тэлефону для збірання розных вестак, вярней кажучы, займацца тэхнічнай справай.

На нарадзе крытыкавалі і абком партыі за недастатковае кіраўніцтва трэцімі сакратарамі райкомаў.

ЛЕКЦЫІ І КАНСУЛЬТАЦЫІ ДЛЯ ВЫВУЧАЮЧЫХ ГІСТОРЫЮ ВКП(б)

ЧЫРВОНАПОЛЛЕ. У адпаведнасці з пастановай ЦК ВКП(б) «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» раённы камітэт партыі распрацаваў канкрэтныя мерапрыемствы па аказанню практычнай дапамогі вывучаючым гісторыю партыі.

Пры райкоме створана лектарская група. Лектарамі вылучаны лепшыя высокакваліфікаваныя прапагандысты.

У снежні будзе прачытана пяць лекцый на тэмы: «Работа над кнігай», аб творы В. І. Леніна «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваююць супроць социял-дэмакратаў», аб творы Плеханава «Роля асобы ў гісторыі», лекцыя аб творы В. І. Леніна «Што рабіць?», лекцыя на тэму «Адмена прыгоннага права ў Расіі».

Пры райпарткабінеце арганізавана групавая і індывідуальная кансультацыя. Праведзены ўжо тры кансультацыі. Вывучаючыя гісторыю партыі звяртаюцца да кансультантаў з рознастайнымі пытаннямі.

АН. ПЯЧЭНІКАЎ.
АЛ. МАХНАЧ.

Агляд друку

ЯРЧЭЙ І ГЛЫБЕЙ АСВЯТЛЯЦЬ ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

Праглядаючы камплект добрушскай райгазеты «Сталінец» (рэдактар тав. Аўчараў), ствараецца ўражанне, што ў раёне канчаткова замерла партыйнае жыццё На самай-жа справе гэта не так. Жыццё партыйных арганізацый Добрушскага раёна, напоўненае большэвіцкім ідэйным зместам, б'е крыніцай.

Але газета чамусьці заняла пазіцыю «неўмяшання» ў справы партыйных арганізацый. Яркім сведчаннем гэтаму з'яўляецца тое, што з жніўня месяца па сённешні дзень толькі ў 7 нумарах газеты змешчан аддзел «Партыйнае жыццё». І ў гэтых нумарах партыйныя пытанні асвятляюцца бледна, павярхоўна, несур'ёзна і непісьменна.

Прывядзем некалькі прыкладаў. У нумары 98 загадчык райпарткабінетам т. Сцепановіч, дарэчы адзін з трох аўтараў на партыйныя тэмы, у заметцы «Раённы парткабінет», паведамляючы аб значэнні парткабінета, піша:

«Раней парткабінет знаходзіўся ў малым памяшканні...»

Ніжэй абзацам чытаем:

«Цяпер памяшканне парткабінета значна пашырана..»

А яшчэ ніжэй у гэтай-жа заметцы гаворыцца:

«Як недахоп трэба адзначыць, што для райпартнабінета адведзен адзін пакой, што з'яўляецца недастатковым для абслугоўвання прапаганды-стаў».

Дазволена будзе запытаць у аўтара гэтай заметкі і рэдактара, які змясціў яе, чаму-ж верыць, калі адзін абзац супярэчыць другому? Сапраўды атрымліваецца, што правая рука не ведае, што робіць левая. Наўрад-ці можа мець якое-небудзь выхаваўчае значэнне такая заметка.

Выпуск «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» — гэтага сталінскага дакумента аб барацьбе і перамогах комуністычнай партыі, выклікаў сярод комуністаў, комсамольцаў, інтэлігенцыі небывалае жаданне добра падрыхтавацца да вывучэння гэтай скарбніцы марксізма-ленінізма. Аднак газета не прыкмячае гэтага жадання. Яна праходзіць міма запросаў вывучаючых гісторыю ВКП(б).

Праўда, у верасні газета змясціла два перадавыя артыкулы, перадрукаваныя з «Правды», пастанову Бюро ЦК КП(б)Б аб вывучэнні гісторыі партыі і «свой уласны» перадавы артыкул, які слова ў слова перадрукавана са «Звязды». У лістападзе газета змясціла адзін артыкул свайго аўтара Янкі Гуцава «Аб індывідуальнай вучобе комуністаў». І больш ні аднаго радка на гэту тэму газета не змясціла.

Раўнадушнасць рэдакцыі газеты да асвятлення пытанняў індывідуальнай вучобы партыйных і непартыйных большэвікоў раёна па авалоданню марксісцка-ленінскай тэорыяй распаўсюджваецца і на асвятленне іншых пытанняў партыйнага жыцця. Най больш ярка выразілася гэта ў такой важнейшай справе, як рост партыі. Добрушская райгазета і тут асталася вернай сваёй пазіцыі «неўмяшання».

19 кастрычніка адбыўся пленум Добрушскага РК КП(б)Б На гэтым пленуме абмяркоўвалася пытанне аб росце партыі. З гэтага поваду рэдакцыя выступіла з перадавым артыкулам, у якім, «распякаючы» райком і пярвічныя партыйныя арганізацыі, асабліва пярвічную партыйную арганізацыю добрушскай папяровай фабрыкі, канстатуе:

«Слабая пастаноўка партыйна-выхаваўчай работы сярод працоўных, няведанне людзей, адарванасць ад мас — вось корань зла марудлівага росту фабрычнай партыйнай арганізацыі».

Далей газета ў пратакольнай форме апавядае, што:

«Дрэнна абстаіць справа з работай сярод спачуваючых—сярод кандыдатаў... сярод комсамольцаў... сярод беспартыйнага актыва».

Праштампаваўшы факты дрэннай работы райкома партыі, пярвічных партыйных арганізацый раёна, газета ні слова не сказала аб сабе. На пленуме-ж райкома моцна гаварылі аб тым, што газета дрэнна дапамагае партыйным арганізацыям раёна ў іх рабоце.

Так, 4 лістапада была надрукавана інфармацыя аб партыйным сходзе на добрушскай фабрыцы. Гэта-ж самая інфармацыя, перароблена ў заметку, была надрукавана 24 лістапада са змяненнем у ёй толькі загалоўка і з прыпіскай наступнага абзаца:

«У першых лічбах гэтага месяца (лістапада—РЭД.), партыйны камітэт фабрыкі «Герой працы» правяў пачын (?!—РЭД.), праведзен партсход па пытанню праверкі выканання рашэнняў справаздачна-выбарчага партсхода».

Вось чым знайшла вдзівіць газета сваіх чытачоў. Які-ж тут можа быць пачын? Ясна, што рэдакцыя газеты, змясціўшы гэту заметку, распісалася ў няведанні пастановы ЦК ВКП(б), дзе ясна сказана, што партыйныя арганізацыі павінны перыядычна адчытвацца перад комуністамі аб сваёй рабоце.

Рэдакцыя добрушскай райгазеты і яе рэдактар тав. Аўчараў маюць усе магчымасці асвятляць партыйнае жыццё шырэй і ярчэй, паказваць усю яго многагранасць, расказваць аб асобных комуністах, аб іх вучобе, росце, культурнасці, авангардная ролі. Шырока, крапатліва і сістэматычна збіраць у адно крупіцы вопыту партыйнай работы, абагульваць яго, папулярызаваць, дапамагаючы гэтым самым выхаванню і росту партыйных кадраў. Вось задача нашых газет.

Для выканання яе рэдакцыі абавязаны прыцягнуць да супрацоўніцтва ў газеце партыйны раённы актыў, членаў і кандыдатаў партыі, а не алгаджваша ад іх, як гэта робіць добрушская райгазета, «кітайскай сцяной». Тады газета стане сапраўдным, баявым памочнікам партыйнай арганізацыі.

„ЛЕГАЛЬНЫ МАРКСІЗМ"

У «Кароткім курсе гісторыі ВКП(б)» напісана: «ВКП(б) расла і мацнела ў прынцыповай барацьбе з дробнабуржуазнымі партыямі ўнутры рабочага руху — эсэрамі (а яшчэ раней з іх папярэднікамі—народнікамі), меншавікамі, анархістамі, буржуазнымі нацыяналістамі ўсіх масцей, а ўнутры партыі — з меншавіцкімі, апартуністычнымі плынямі, — трацкістамі, бухарынцамі, нацыянал-ухілістамі і іншымі антыленінскімі групамі».

Усе гэтыя партыі і палітычныя групіроўкі з'яўляліся ворагамі рабочага класа, ворагамі яго рэволюцыйнага авангарда — Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў). У ліку ворагаў рабочага класа і яго партыі Леніна — Сталіна знаходзіліся і «легальныя марксісты». «Легальны марксізм» прадстаўляў сабою літаратурна-палітычную плынь сярод ліберальнай буржуазнай інтэлігенцыі, на чале якой знаходзіліся такія абаронцы капіталізма, як П. Струве, М. Туган-Бараноўскі, С. Булгакоў, Н. Бердзяеў і інш.

«Яны друкавалі свае артыкулы ў легальных, гэта значыць дазволеных царскім урадам, газетах і журналах. Таму іх і пачалі называць «легальнымі марксістамі». («Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» стар. 22).

З'яўленне гэтай літаратурна-палітычнай плыні на гістарычнай арэне выклікана наступнымі акалічнасцямі.

Перыяд у развіцці сусветнай гісторыі паміж 1872—1904 годам характарызуецца ростам пролетарскіх партый, якія, абапіраючыся на буржуазны парламентарызм, ствараюць сваю друкаваную прэсу, усякага роду асветныя ўстановы, свае прафесіянальныя саюзы, свае кааператывы. Марксізм у гэты перыяд атрымлівае сваю перамогу. Ён ідзе ўшыр.

«Павольна, але няўхільна ідзе ўперад працэс падбірання і збірання сіл пролетарыята, падрыхтоўкі яго да надыходзячых бітваў.

Дыялектыка гісторыі такава, што тэарэтычная перамога марксізма прымушае ворагаў яго **пераапранацца** марксістамі. Унутрана-згніўшы лібералізм прабуе ажывіць сябе ў выглядзе социялістычнага **апартунізма.** Перыяд падрыхтоўкі сіл для вялікіх бітваў яны тлумачаць у сэнсе адмаўлення ад гэтых бітваў. Палепшанне становішча рабоў для барацьбы супроць наёмнага рабства яны растлумачваюць у сэнсе продажу рабамі за пятачок сваіх правоў на свабоду. Трусліва прапаведуюць «социяльны мір» (гэта значыць мір з рабаўласніцтвам), адмаўленне ад класавай барацьбы і т. д. Сярод социялістычных парламентарыяў, розных чыноўнікаў рабочага руху і «спачуваючай» інтэлігенцыі ў іх вельмі многа прыхільнікаў» (Ленін. т. XVI стр. 332).

У Заходняй Еўропе ўзнікае значная колькасць груп і сект, якія, прыкрываючыся сцягам марксізма, рэвізуюць, скажаюць марксізм ва ўгоду буржуазіі, робяць яго бяскрыўдным для эксплаататараў вучэннем, выхалашчваюць яго рэволюцыйную душу. На шлях адкрытай рэвізіі вучэння Маркса ў Германіі выступіў Бернштэйн. Усе і ўсякага роду скажальнікі марксізма знаходзілі абгрунтаванне сваёй тэорыі ў бернштэйніянцтве.

Ва ўмовах рускага жыцця адной з асноўных палітычных плыняў, праводзіўшых рэвізію, скажэнне марксізма ва ўгоду буржуазіі з'яўляўся «легальны марксізм». Развіццё капіталізма і ўтварэнне сучаснага прамысловага пролетарыята паслужыла трывалай асновай для шырокага распаўсюджання марксізма ў Расіі, для росту рэволюцыйнага руху рабочага класа. Да гэтага магутнага грамадскага руху пачалі прымазвацца ўсякага роду «спадарожнікі». Да гэтых «спадарожнікаў» адносіліся «легальныя марксісты», якія пачалі апранацца ў марксісцкія адзенні, пачалі рэвізаваць марксізм.

«Легальныя марксісты» не мелі нічога агульнага з рэволюцыйным марксізмам. Яны былі злейшымі ворагамі вучэння Маркса. Яны змагаліся з народніцтвам не з пролетарскіх, рэволюцыйных, а буржуазных пазіцый.

В. І. Ленін даў наступную характарыстыку «легальным марксістам»:

«Гэта былі буржуазныя дэмакраты, для якіх разрыў з народніцтвам азначаў пераход ад мяшчанскага (або сялянскага) социялізма не да пролетарскага социялізма, як для нас, а да буржуазнага лібералізма». (Ленін, т. XII, стар. 57).

Ленін паказаў, «што «легальны марксізм», «эканамізм» і «меншавізм» з'яўляюцца рознымі формамі праяўлення адной і той-жа гістарычнай тэндэнцыі. «Легальны марксізм» п. Струве (1894) і яму падобных быў **адлюстраваннем марксізма ў буржуазнай літаратуры».** (Там-жа, стар. 69).

Галоўным прадстаўніком «легальнага марксізма» ў Расіі з'яўляўся П. Струве. Яго кніга «Крытычныя заметкі да пытання аб эканамічным развіцці Расіі», якая вышла ў свет у 1894 годзе, была першым выступленнем «легальнага марксізма» ў Расіі, у якой апошні вызначыў свае адносіны да марксізма наступным чынам:

«Прымыкаючы па некаторых асноўных пытаннях да зусім вызначыўшыхся ў літаратуры поглядаў, ён (аўтар) нікольні не лічыў сябе звязаным літарай і кодэксам якой-небудзь дактрыны. Артадоксіяй ён не заражон» (Ленін, т. I, стар. 225).

У гэтым творы П. Струве рэвізаваў марксізм па асноўных пытаннях. Наперакор вучэнню марксізма аб дзяржаве, як арганізацыі класавага панавання, П. Струве абвясціў дзяржаву надкласавай арганізацыяй, з'яўляючайся ў першую чаргу арганізацыяй парадку, прыміраючай класы, згладжваючай класавыя антаганізмы, адмаўляў наяўнасць у капіталістычным грамадстве супярэчнасцей, вядучых гэта грамадства да немінучай гібелі, выключаў магчымасць пролетарскай рэволюцыі і ўстанаўлення дыктатуры пролетарыята. Ён не дапускаў і мыслі аб тым, што капіталізм павінен быць зменен больш высокім, больш перадавым грамадскім ладам — социялізмам. Пяснір капіталістычнай эксплаатацыі з усіх сіл усхваляўład капіталізма, абвяшчаў капіталізм магутным фактарам «культурнага прагрэса», заклікаў усіх і ўсяе да абароны капіталістычнага наёмнага рабства, лічыўład капіталізма ідэальным ладам, заклікаў прызнаць нашу некультурнасць і пайсці «на вывучку да капіталізма».

Абараняючы з усіх сіл буржуазную «цывілізацыю», П. Струве скажаў тэорыю марксізма аб класах і класавай барацьбе ва ўмовах капіталізма, а народныя няшчасці, якія параджаюцца капіталізмам (беспрацоўе, жабрацтва мас) прадстаўляў не як з'яву капіталістычнага парадку, а як рэзультат перанасялення, як акт прыроды, незалежны ад капіталістычнага ладу. У апошнім пытанні П. Струве цалкам салідарызаваўся з тэорыяй Мальтуса, які прапаведваў, што народанасяленне расце быстрэй, чым сродкі існавання, што выторчасць сродкаў існавання не паспявае за ростам насельніцтва, што галеча, жабрацтва і пакуты мас не залежаць ад буржуазіі, ад капіталізма.

В. І. Ленін выкрыў да канца апалагетыку капіталізма П. Струве, паказаў яго варожыя марксізму пазіцыі. У сваёй рабоце «Эканамічны змест народніцтва і крытыка яго ў кнізе п. Струве», Ленін падверг жорсткай крытыцы погляды п. Струве. Барацьба Леніна супроць П. Струве і іншых «легальных марксістаў» мела велізарнае значэнне. Яна з'явілася найвялікшым укладам у скарбніцу марксізма, узбагачэннем марксізма.

Крытыкуючы «легальны марксізм», як варожую рэволюцыйнаму марксізму палітычную плынь, В. І. Ленін адначасова ўказваў, што ў барацьбе супроць народніцтва, як галоўнейшага ворага марксізма, магчыма часовае пагадненне з «легальнымі марксістамі» на пэўных умовах. Крытыкуючы людзей «празмерна прамалінейна гледзячых на справу», Ленін пісаў у «Што рабіць?»

«Баяцца часовых саюзаў хаця-б і з ненадзейнымі людзьмі можа толькі той, хто сам на сябе не спадзяецца, і ні адна палітычная партыя без такіх саюзаў не магла-б існаваць. А злучэнне з легальнымі марксістамі было свайго роду першым сапраўды палітычным саюзам рускай социял-дэмакратыі. Дзякуючы гэтаму саюзу была дасягнута здзіўляюча быстрая перамога над народніцтвам і велізарнае распаўсюджанне ўшыр ідэй марксізма (хаця і ў вульгарызіраваным выглядзе)». (Ленін, т. IV, стар. 374).

Саюз з «легальнымі марксістамі» быў заключан на пэўных умовах, якія прадстаўлялі поўную магчымасць социялістам «...раскрываць рабочаму класу варожую процілегласць яго інтарэсаў і інтарэсаў буржуазіі» (Там-жа, стар 374). І калі гэта магчымасць знікла, разрыў з «легальнымі марксістамі» быў праведзен самым рашучым чынам. Абгрунтоўваючы гэты разрыў, В. І. Ленін пісаў:

«А тое бернштэйніянцтва і «крытычны» напрамак, да якога павальна звярнулася большасць легальных марксістаў, адымала гэту магчымасць і разбэшчвала социялістычнае сазнанне, апашляючы марксізм, прапаведуючы тэорыю прытуплення социяльных супярэчнасцей, абвяшчаючы недарэчнасцю ідэю социяльнай рэволюцыі і дыктатуры пролетарыята, зводзячы рабочы рух і класавую барацьбу да вузкага трэд'юніянізма і «рэалістычнай» барацьбы за дробныя, паступовыя рэформы. Гэта ўпаўне роўнасільна было адмаўленню з боку буржуазнай дэмакратыі права на самастойнасць социялізма, а значыць, і права на яго існаванне; гэта азначала на практыцы імкненне ператварыць пачынаючыйся рабочы рух у хвост лібералаў» (там-жа, стар. 374—375).

Гэта акалічнасць і паслужыла прычынай разрыву рэволюцыйных марксістаў з «легальнымі марксістамі», што вылілася ў простае ўдаленне социял-дэмакратаў «з найбольш усім даступнай і шырока распаўсюджанай «легальнай» літаратуры» **(Ленін).**

У «Прадмове да зборніка «За 12 год» Ленін паказвае тую барацьбу, якая праведзена Леніным і рэволюцыйнымі марксістамі з «легальным марксізмам» і «легальнымі марксістамі» пп. Струве, Булгаковым, Туган-Бараноўскім, Бердзяевым і т. п. Нават у той перыяд, калі рэволюцыйныя марксісты знаходзіліся ў часовым саюзе з «легальнымі марксістамі», Ленін не пераставаў крытыкаваць апошніх, выкрываць іх, як буржуазных дэмакратаў, рэвізуючых марксізм ва ўгоду буржуазіі. Яшчэ ў 1895 годзе Ленін указваў, што п. Струве марксіст ненадзейны, што ад яго социял-дэмакраты павінны адгарадзіцца.

У сваім запісу ад 29 снежня 1909 года В. І. Ленін дае яркую характарыстыку «Блізнецу» (П. Струве), на аснове гутаркі з ім аб супрацоўніцтве:

«Блізнец паказаў сябе з зусім новага боку, паказаў сябе «палітыкам» чыстай вады, палітыкам у горшым сэнсе слова, палітыканам, прайдзісветам, таргашом і нахалам... Блізнец з'явіўся з верай у наша бяссілле, з'явіўся прапаноўваць нам умовы **здачы** і ён прарабіў гэта ў адменна ўмелай форме, не сказаўшы ні аднаго рэзкага слоўца, але выявіўшы тым не менш, якая грубая, таргашаская натура дзюжыннага ліберала крыецца пад гэтай ізяшчнай, цывілізаванай абалонкай саманавейшага «крытыка» (Ленін, т. IV, стар. 67).

У Закаўказзі выразіцелем ідэй «легальнага марксізма» з'яўлялася большасць «Месаме-дасі» на чале з Н. Жорданія, супроць якога вяла непрымірымую барацьбу ленінска-іскраўская група социял-дэмакратаў Закаўказзя на чале з таварышам Сталіным. У сваіх легальных работах Н. Жорданія ўсхваляў капіталізм і даказваў неабходнасць саюза рабочага класа з ліберальнай буржуазіяй, прапаведваў гармонію класавых інтарэсаў, даказваў, што ўвесь уклад развіваючагася капіталізма, развіццё нацыянальнай культуры і нацыянальнага характару злучаюць у адзіны нацыянальны арганізм усе класы капіталістычнага грамадства.

«Нацыя ўпраглася ў агульнае ярмо, — пісаў ён, — прывыкла да сумеснага жыцця і сумеснай дзейнасці. Падрыхтавалася глеба для общынасці сазнання». (Л. Берыя «Да пытання аб гісторыі большэвіцкіх арганізацый у Закаўказзі». (Партвыдат, 1935 г., стар. 10).

Група Н. Жорданія адмаўляла неабходнасць нелегальнага друку, адмовілася праводзіць масавую агітацыю і адкрытую барацьбу з самадзяржаўем.

«...у рашучай і непрымірымай барацьбе супроць грузінскага легальнага марксізма, — піша тав Берыя, — супроць большасці «Месаме-дасі» на чале з Н. Жорданія, **зарадзілася, аформілася і вырасла пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна рэволюцыйная ленінска-іскраўская социял-дэмакратычная большэвіцкая арганізацыя ў Закаўказзі.** (Там-жа, стар. 15).

Ф. КОШЭЛЕЎ.